3. *Равков, А. А.* Документ мира и безопасности / А. А. Равков // Беларус. думка. – 2016. – № 8. – С. 3–10.

4. *Кревельд, ван М.* Трансформация войны / М. ван Кревельд – М.: Альпина Бизнес Букс, 2005. – 344 с.

5. *Круглов, В. В.* Новый подход к анализу современного противоборства / В. В. Круглов // Воен. мысль. – 2006. – № 12. – С. 50–61.

6. *Бек, У.* Космополитическое мировоззрение / У. Бек – М.: Центр исслед. постиндустриального общества, 2008. – 336 с.

7. *Кортунов, С. В.* Диалектика национальной и международной безопасности: некоторые методологические проблемы / С. В. Кортунов // Полит. исслед.– 2009. – № 1. – С. 7–28.

8. Советская военная энциклопедия: в 8 т. / пред. гл. ред. комиссии Н. В. Огарков. – М.: Воениздат, 1979. – Т. 7. – 687с.

9. Советская военная энциклопедия: в 8 т. / пред. гл. ред. комиссии Н. В. Огарков. – М.: Воениздат, 1977. – Т. 3. – 672 с.

10. *Мукин, Ю.* Использование гражданских контрактников и частных вооруженных формирований в современных конфликтах / Ю. Мукин // Зарубеж. воен. обозрение. – 2008. – № 7. – С. 26–31.

11. *Нельсон, Д. Н.* По ту сторону планирования обороны / Д. Н. Нельсон // Консорциум «Партнерство ради мира» воен. акад. и ин-тов по изучению вопросов безопасности. – 2002. – Т. 1. – № 2. – С. 115–128.

12. *Жадобин, Ю. В.* Армия белорусского народа / Ю. В. Жадобин // Беларус. думка. – 2013. – № 2. – С. 3–10.

13. *Коллмер, С.* Дети-солдаты – составной элемент новых нерегулярных войн? / С. Коллмер // Консорциум «Партнерство ради мира» воен. акад. и ин-тов по изучению вопросов безопасности.– 2004. – Т. 3.– № 3. – С. 1–12.

14. *Попов, И. М.* Война будущего: взгляд из-за океана: Военные теории и концепции современных США / И. М. Попов. – М.: АСТ; Астрель; Транзиткнига, 2004. –444 с.

**(Дата подачи: 17.02.2017 г.)**

*Н. С. Клішэвіч*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
*N. Klishevich*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 009**

# ВАЙНА ЯК СТАРАЯ І НОВАЯ АНТРАПАЛАГІЧНАЯ ПРАБЛЕМА

# WAR AS OLD AND NEW ANTHROPOLOGICAL PROBLEM

*У артыкуле аналізуецца канцэпт «вайна» як прынцыповы канец аднаго і пачатак іншага, дзе вайна выступае як спосаб пабудовы мыслення новага тыпу, дзе вйна як своеасаблівы дысэнсус грамадства, які вядзе да будучыні. Пераасэнсоўваюцца маральныя і сацыяльныя асновы сучаснага грамадства з улікам глабальных змен у свеце.*

*Ключавыя словы: канцэпт «вайна»; дысэнсус грамадства; быццё «на зломе»; этычная рэгуляцыя; «сеткавая вайна»; кропкі пераасэнсавання; чалавечае жыццё; чалавечае «Я»; творчасць Васіля Быкава; антрапалагічная праблема; палярныя каштоўнасці; экзістэнцыйны выбар.*

*The article analyzes the concept of «war» as the fundamental end of one and the beginning of another, where the war serves as a way of building a new type of thinking, where vyna dysensus as a kind of society that leads to the future. To rethink the moral, political and legal foundations of the modern society, taking into account global changes in the world.*

*Key words: the concept of «war»; dysensus society; Being «on a break»; ethical regulation; «Network war»; rethinking point; human life; the human «I»; creativity Vasilya Bykova; anthropological problem; polar values; existential choice.*

«Згубленае пакаленне» – здаецца так прынята ў літаратуры называць людзей, чый лёс выпаў на ваенны час. Сапраўды, нічога светлага вайна не нясе, акрамя стратаў, разбурэнняў, болю, няшчасця і смерці. Так чаму ж чалавецтва не вылазіць з войнаў? Каму чаго не хапае? Каму гэта патрэбна? Вайна можа выступаць як прынцыповым канцом аднаго і пачаткам іншага, таго, чаго ніколі не існавала, і ў гэтым сэнсе, з доляй абсурду, можна сказаць, што яна выступае своеасаблівым жахлівым чысцілішчам, пасля якога чалавецтва павінна задумацца, як стаць людзьмі асобага гатунку. І ў гэтым выпадку вайна выступае як спосаб пабудовы мыслення новага тыпу.

На вопыце чалавека, які вырас на вайне, мы можам шмат чаго расказаць грамадству. Нам пашчасціла толькі назіраць, з якой настойлівасцю «выпісывалі» са свайго ўнутранага свету жахі і пакуты вайны В. Быкаў, Р. Барадулін, Н. Гілевіч, А. Вярцінскі, мастак М. Савіцкі з яго незагойнымі «Лічбамі на сэрцы», якія, нібы выбітыя коды, назаўжды застануцца ў ментальнай памяці пакаленняў, як пісала пра  жанчын на вайне С. Алексіевіч.

Вайна выступае своеасаблівым месцам, дзе гартуюцца чалавечыя душы, дзе вырастае новы чалавек-універсум, дзе ўчынак каштоўны для самога чалавека тым, што ён становіцца вынікам глыбіннага асабістага волевыяўлення, менавіта тым дыялектычным пераўвасабленнем «грамадскага» у асабістае, агульнага ў адзінкавае. Вайна як своеасаблівы дысэнсус грамадства, які вядзе да будучыні. Дысэнсус, які паказвае неабходнасць разрыва з адсутнасцю выбару, як выбух, які змяняе сэнс мыслення, код, які пашырае межы сэнсу да стану абсурду (адваротнага боку сэнсу). А можа нам сапраўды стаць грамадствам дысэнсусу, якое, на думку сучаснага беларускага філосафа П. Баркоўскага, робіць стаўку на талерантнасць, патрыятызм і ўнікальнасць кожнага чалавека? Гэта тое, пра што і казаў у сваіх творах В. Быкаў, сціпла, без асаблівага пафасу, па-хрысціянску заглыблена. Дысэнсус – гэта не зусім адсутнасць згоды з-за непадобнасці ў меркаваннях, у поглядах, а своеасаблівы штуршок пошуку іншых высноў, менавіта з-за нязгоды, «dissent» пры перакладзе з англійскай мовы на рускую – «разногласие», становіцца цудоўным «рознагалоссем» па-беларуску. Жаданне пачуць кожнага і не згубіць сябе – вось што галоўнае ў грамадстве дысэнсусу. Гэта – пэўная магчымасць будаваць грамадства іншым чынам, магчыма, гэта – недасяжная будучыня, а магчыма, гэта – су-быцце (со-бытие), як сумеснае бытаванне, а магчыма, як беларуская па-дзея – імкненне да дзеяння.

Складанасць і бесчалавечнасць асяроддзя ваеннага часу робіць відавочным тое, што не так відавочна ў паўсядзённасці. Каб перамагчы, людзі вымушаны шукаць «залатое правіла», а яно ўжо існуе, трэба толькі пачаць выконваць. Яно існуе спакон веку ва ўсіх канфліктуючых культурах і на дзіва гучыць амаль аднолькава, а гэта значыць, што яно прэтэндуе на абсалютнасць: «Не рабі іншаму таго, чаго не жадаеш каб рабілі табе». Найстаражытнейшай крыніцай лічыцца «Павучэнні пісца Ахікара» (705–681 гг. да н. э.). Быць абсалютным правілу дазваляе тое, што яно робіць чалавека суб'ектам асабістых дзеянняў, вымагае яго дзейнічаць як уладальніка над сваімі жаданнямі (учынкамі), ці па-быкаўскі «ад кожнага на вайне залежыць усё», таму тут вельмі важным з'яўляецца яшчэ аспект вайны з самім сабой за права быць чалавекам.

З іншага боку, вайна ўяўляецца феноменам, які выходзіць за рамкі палітычных працэсаў у якасці шырокамаштабнага сацыяльнага і культурнага крызісу. Гэты сацыяльны прыпадак, у гістарычнай перспектыве мысліцца як неабходнасць грамадству любой эпохі: войны былі, ёсць і будуць, паколькі ў палітычным, гістарычным і экзыстэнцыяльным сэнсе яны аказваюцца функцыянальнымі і нават прэскрыптыўна неабходнымі. Пры гэтым важна мець на ўвазе, што чалавецтва сёння падышло да пераломнага моманту сваёй «ваеннай» эвалюцыі і ўпершыню ў гісторыі яно можа вырашаць: ці стане яно апошнім у гісторыі ці першым на новым этапе развіцця. Канфлікты ствараюць няўстойлівасць і напругу ў структуры як міжнародных адносін, так і міжчалавечых стасункаў і таму, калі складаныя адкрытыя сістэмы дасягаюць крытычнай нестабільнасці, для іх настае момант праўды: яны або трансфармуюцца, або разбураюцца. У кропках ваеннай біфуркацыі, калі сусветная сацыяльна-эканамічная і палітычная сістэмы дэстабілізаваныя, блізкая да страты раўнавагі, магчымая рэалізацыя сцэнараў хаатызацыі грамадства, наступ трагічнага чалавечага быцця «на заломе».

Не гледзячы на тое, што Вялікае Княства Літоўскае пачынаючы з XVI ст., робіцца зонай вайсковых дзеянняў, тэрыторыяй, якая прымае на сябе і стрымлівае нашэсце з Усходу; у руска-польскай вайне 1654–1667 гг. загінула каля 50 % насельніцтва; з канца XVIII ст. беларускія землі апынаюцца ў складзе Расійскай імперыі, беларусы, кажучы пра «вайну», узгадваюць адразу Вялікую Айчынную. Можа таму, што яшчэ не ўсе сведкі памерлі, а можа, з-за жахлівых страт, з-за вайны не толькі як палігона ваенных дзеянняў, а як парушальніка межаў паміж «сваімі і чужымі», «ворагамі і героямі», разбурыла веру ў чалавека. Гледзячы на апошнія войны, у тым ліку і ва Украіне, становіцца зразумелым, што патрабуюцца іншыя перспектывы асэнсавання вайны. Канцэпт «вайна» выцясняецца з палітычнага лексікону, усе часцей кажуць пра «спецаперацыі», «кропкавыя ўдары», «контртэрарыстычныя меры». Але усё ж такі асноўнае не змянілася – гэта падаўленне волі «суперніка» падпарадкаванне аднаго чалавека другому. Калі раней гэта часцей за ўсё дасягалася з дапамогай зброі, асабліва што тычыцца мірнага

насельніцтва, то зараз у сувязі з разрастаннем інфармацыйнай прасторы, звесткі пра вайну выходзяць далёка за межы грамадска-палітычнага жыцця ваюючых бакоў. Развіццё прасторы Інтэрнэту прыводзіць да станаўлення так званай «сеткавай вайны», якая грунтуецца на прынцыпах волі інфармацыі і адрозніваецца яркім індывідуалізмам, прыматам фармальнага над нефармальным, «ваенные дзеянні» тут замяняюцца паняццем «хакерства», «кіберанархізм» і «сеткавага лібертыянства».

У такіх «ваенных» сучасных умовах нормы традыцыйнай этыкі, маральныя запаведзі, якімі чалавецтва карыстаецца на працягу стагоддзяў, не ў поўнай меры забяспечваюць механізмы этычнай рэгуляцыі ў вобласці палітыкі, эканомікі, міжнароднай дзейнасці, а таксама чалавечых стасункаў. Безумоўна, гэта свайго роду сацыяльны заказ на распрацоўку маральна-палітычных і прававых асноў сучаснага грамадства, што ўлічвае глабальныя змены сучаснага свету і адрасаваны, перадусім, падрастаючаму пакаленню. Што адбываецца з моладдзю, асобай ва ўмовах сецівага свету, віртуалізацыі сацыяльнай прасторы, масавізацыі культуры, праблематызацыі нацыянальнай ідэнтыфікацыі чалавека і дзяржавы, бязмежнымі абрысамі волі і граніц асобы? Чалавечае «Я» ўсё больш пераўтвараецца ў кропку зборкі, нелінейную хвалю волі і адказнасці, вандроўніка ў стыхіях магчымага быцця. У адпаведнасці з новымі выклікамі сучаснасці вайна за фізічнае знішчэнне працягваецца, але ўжо на ўзроўні барацьбы за інтэлект, за станаўленне транснацыянальнай, трансдысцыплінарна-сінэргетычнай, наасфернай, «чалавекаразмернай», сацыяльна-палітычнай карціны сацыяльнай рэальнасці [4]. Падобную выяву свету нельга стварыць і зразумець, не змясціўшы ў яе жывую, свядомую адчувальную істоту, якая разумее гэтыя заканамернасці, рэзанансна рэагуе на незваротныя працэсы, што адбываюцца ў Космасе, на Зямлі, у асобнай краіне, арганізацыі, з асобным чалавекам. А пакуль, не гледзячы на змены вакол, чалавечая прырода, людзі ў інстынктах сваіх амаль не змяніліся.

У сумесным праекце «Дыскусыйны клуб» «нямецкай хвалі» (Кёльн) і «Радыё рацыя» (2009 г.) прагучала такое пытанне: «Чаму В. Быкаў паехаў на Захад, а не на Ўсход? Як яму жывецца ў краіне, супраць якой ваявалі ён самі яго літаратурныя героі»? Кажучы пра зменнасць часу, пісьменнік тады адзначыў яшчэ і вельмі істотную з’яву, якую можна назваць пераасэнсаванем каштоўнасцяў, рэфлексіей народа, тым, што Германія становіцца ліберальна-дэмакратычнай краінай, у адрозненне ад некаторых краін, якія не могуць пазбавіцца камуністычнага прошлага. Важнай кропкай у гэтым пераасэнсаванні стаў Нюнбегргскі працэс. Калі гэты працэс можна лічыць рэфлексіей фашызма, то рэфлексіі камунізма не адбылося. С. Дубавец кажа, што І. Абдзіраловіч «патрапіў да нас» (размова пра эссэ «Адвечным шляхам») акурат тады, калі ў душы ўжо адбылося развітаньне з камунізмам і зняверанне ў ягоных ідэалах і самой сістэме, акурат калі мы шукалі іншага, што і ўвасобілася ў беларускай ідэі. Мы чыталі кнігу далей, дзе ў такім самым

узьнёслым стылі гаварылася пра Беларусь, усю яе мінуўшчыну, ваганьне паміж Захадам і Ўсходам і немагчымасьць прыняць ні тое, ні тое. Заўважце, аўтар піша не столькі пра беларускую краіну і народ, колькі пра беларускую душу. Яна таксама засталася нязменнай. «За даўгія вякі гнёту і зьдзеку над нашай душой мы ўцямілі, што якую скуру сілком не накінь чалавеку, ён застанецца незадаволеным, бо заўсёды ён захоча перш-наперш быць самім сабой, чалавекам, а не замарожаным каталіком або праваслаўным, выгаленым на адзін капыл расейцам, ці паляком, прававерным буржуём, ці камуністым. У гэтыя цесныя мізэрныя рамкі не ўсадзіць вялікай душы чалавека. Векавое дасьвядчэньне кажа нам, што вольнага разьвіцьця нашага духу не запяўняе ні заходняя ні ўсходняя культура, бо яны абяртаюцца ў формах гвалтоўнага, людаежнага мэсыянізму і розьніца між імі толькі ў назовах, лёзунгах, а іх аціскаючыя ланцугі – аднолькавы для нашага духу. Трэба шукаць на другіх шляхох…» [1, с. 12–13].

Любая перамога на вайне – каштуе чалавечага жыцця і гэтыя ахвяры, ператвараючыся ў калектыўную памяць, павінны быць не дарэмнымі. «Мне думаецца, што было б неразумна  не звяртаць увагу на той вопыт, які мільены людзей вынеслі з вайны, да таго ж аплачаны дарагой цаной. І мяне цікавіць у першую чаргу не сама вайна, нават не яе побыт і тэхналогія бою, хоць усё гэта для мастацтва таксама важна і цікава, але галоўным чынам маральны свет чалавека, магчымасці яго духу» [2]. Пісаць В. Быкаў стаў пазней, занадта цяжкімі былі ўспаміны. Галоўнае ў яго творах – апісанне адносін людзей, погляд у чалавека, у самую душу, у глыбіні неспазнанага чалавекам у самім сабе, туды, дзе зараджаецца сумнеў, які прыводзяць да хлусні і несправядлівасці. Вось тая мяжа, якая дае беларускай культуры і філасофіі пісьменніка-філосафа. Творчасць Быкава з’яўляецца неад’емнай часткай беларускага філасофска-культурнага асяроддзя свайго часу. Майстар псіхалагічных сітуацый, даследчык чалавечых душ, пісьменнік, у творах якога запар – памежкавая сітуацыя, выбар паміж палярнымі каштоўнасцямі, поцемкі чалавечай душы. Усё гэта, вядома, характэрна для таго нялёгкага часу, у якім жыў і пра які пісаў Васіль Быкаў. Чалавек, які доўгі час знаходзіцца паміж палярнымі каштоўнасцямі, здзяйсняе ўнікальны экзістэнцыйны выбар пад уплывам усведамлення непазбежнасці смерці і жадання жыць. Унікальнасць выбару ў тым, што ён непаўторны і непрадказальны, ён адзіны ў сваім родзе, здзяйсняючы яго, чалавек знаходзіць сябе, гэта значыць, у канчатковым выніку ён вызначае сябе выбарам.

Гэта прасочваецца на ўсім творчым матэрыяле пісьменніка. Прычым, праз экзістэнцыйныя пошукі чалавека паказваецца недасканаласць соцыуму і шматлікія сацыяльныя хібіны. Цікава, што адзінкавы існуючы чалавек не становіцца ідэяй, не массавізуецца. Стан «быць менавіта такім адзінкавым чалавекам» закладзены ў падкорку быкаўскіх герояў. Гэта дае нам падставу гаварыць пра нейкі нябачны подых часу, прыпадобіць пісьменніка да мысляра свайго часу і такім чынам да філосафа.  У пачатку творчасці, праз

адзінкавасць і непаўторнасць чалавечага ўчынку, пісьменнік больш паказвае што адзінкавы чалавек для сацыяльнай машыны – ідэя, а дзеля агульнай ідэі ніякія страты не могуць лічыцца неапраўданымі. Менавіта сябе і сваю чалавечнасць (сутнасць) мы можам спазнаць праз свабоду, але што ж такое свабода для чалавека? На вайне мы прагнем да свабоды, гэтая абстракцыя набывае найвышэйшую каштоўнасць у гэты час, і становіцца кардынальнай каштоўнасцю на ўсё жыццё. Але ці патрэбная яна яму? Па словах А. Камю «гэта цяжкая ноша» несці цяжар якой не здолее кожны. Ідэі выказаныя В. Быкавым як прадстаўніком беларускай культурнай спадчыны і французскімі экзітэнцыялістамі выступілі фактарам і крыніцай інтэлектуалізацыі літаратуры і злучаных з гэтым працэсам мастацкіх эксперыментаў, накіраваных на адэкватную перадачу адпаведнага комплексу светапоглядных канцэпцый. В. Быкаў, вывучаючы экзістэнцыйныя станы асобы, для напісання вобразаў сваіх герояў звяртаўся да творчасці Ж.-П. Сартра, каб зверыць свае жыццёвыя ўражанні з уражаннямі прызнаных сучаснікаў. Філасофія жыцця па Быкаву з цягам часу стала яшчэ больш песімістычнай, стылёвы каларыт больш змрочным, высновы, асабліва ў апошніх аповесцях і апавяданнях, нягледзячы на моцны сарказм, не пакідаюць надзеі на лепшае. Таму, здаецца, што філасофска-песімістычны настрой Быкаўскіх апавяданняў і аповесцяў цалкам сугучны творчасці А. Камю і Ж.-П. Сартра.

Героі В. Быкава часцяком меўшыя рэальныя прататыпы праходзяць праз «памежкавыя сітуацыі» (К. Ясперс, Ж-П. Сартр, В. Быкаў) альбо «эксцэнтрычныя рэакцыі» (Х. Плеснер) ставяць чалавека ў такія ўмовы, калі найбольш ярка праяўляюцца яго маральныя якасці, а лепшымі для вывучэння мадэлі паводзін чалавека служаць менавіта пераломныя моманты, войны, катаклізмы. У інтэрв'ю з М. Матукоўскім ў 1972 г. В. Быкаў прасіў не атаясамліваць абсалютна яго біяграфію з яго творамі творамі, але натуральна і тое, што многае з пражытага апісана ў творах. Найбольш аўтабіяграфічная «Трэцяя ракета». Не раз аўтара папракалі ў залішняй «драматызацыі» у аповесцях, гэта яшчэ адно пацверджанне блізкасці да экзістэнцыяльнага кірунку: адчуванні безвыходнасці, прыгнечанасці, «млоснасці» (Сартр), як раз і перадаюць тое, што адбывалася на вайне.

Існаваць у якасці адзінкавага чалавека – гэта зусім іншае, чым быць недасканалай экзістэнцыяй. Для таго, каб зразумець прыроду адзінкавасці экзістэнцыі трэба прасачыць не адзін, а тысячы ўчынкаў, але нават і гэта не дасць нам грунтоўнай падставы сцвярджаць як  менавіта гэтая адзіночная экзістэнцыя здзейсніць свой выбар. Усё здаецца добра апынаецца для героя Сушчэні (аповесць «У тумане»), але праз ці то сваю чалавечую прыроду, ці то праз выпадковыя абставіны, ён трапляе ў сітуацыю, калі ў чалавека сапраўды няма выйсця. Сам таго не разумеючы, напэўна, Быкаў рыхтуецца да хрысціянскага вобраза ахвярнасці. Дарэчы сказаць, што аднаіменны фільм С. Лазніцы цудоўна перадае гэты вобраз. Адсутнасць музыкі ў

фільме, дае магчымасць «пачуць» трагедыю чалавека праз дыялогі, праз учынкі, зрабіць больш рэальнымі падзеі, не падказываць гледачам моманты напружанасці, а дазволіць ім быць уключаным ў гэты працэс, адчуць быццам сучасны 3D эфект – эфект «прысутнасці» гледача ў месцы падзей і паглядзець вачыма персанажаў на сітуацыю, стаць як бы саўдзельнікамі дзеяння, а не тымі, хто выносіць вердзікт, не адчуўшы ўсе на сваей скуры.

Вайна як антрапалагічная праблема пачынае гучаць праз «трагедыі мірнага часу» ў аповесці «Аблава», потым праз сімвалізм раскрываецца ў аповесцях «Знак бяды», «Пастка», «Мёртвым не баліць», «Пайсці і не вярнуцца», праз матывы тугі і трывогі ў 80 г., праз песімізм і зноў звяртаючыся да больш заглыбленага філасофскага сімвалізму ў 90-я г. у апавяданнях «Перад канцом», «Музыка», «Труба». і інш. Майстар нібыта дасягнуў новых вяршыняў пераходзячы ад рэалізму і псіхалагізму да сімвалізму з яго множнасцю кодаў. Пра свабоду як недасяжную філасофскую катэгорыю, пра смерць, якая можа стаць жыццем, пра абсурд, які становіцца сэнсам. Пра вайну, як нязменны феномен, які быццам і мае прагрэсс ў сваім развіцці, але застаецца нязменным па-сутнасці.

У канчатковым выпадку як казаў дацкі мысляр С. Кьеркегор дзіўны бок жыцця як раз у тым, што кожны чалавек, хто звяртае ўвагу на самога сябе, ведае тое, чаго не ведае ніякая навука, бо ён ведае, хто ён, а ў гэтым і заключаецца сутнасць грэчаскага выказвання: спазнай самога сябе [3].

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам / І. Абдзіраловіч. – Менск: Навука і тэхніка, 1993. – 4-е выд. – 13 с.

2. *Быкаў, В.* Успаміны. Великая академия – жизнь / Быкаў [Электронный ресурс] // Диалог: В. Быков – Л. Лазарев. – Дата доступа: http://knihi.com/Vasil_Bykau/Publicistika-ru.html#chapter15.

3. Кьеркегор и современность: сб. статей. – Минск: РИВШиГО, 1996. – 24 с.

4. *Яскевич, Я. С.* Философия и наука: время диалога, ответственности и надежды / Я. Яскевич. – Минск: Право и экономика, 2014. – С. 511.

**(Дата подачи: 20.03.2017 г.)**